УДК 808.26-3

В.М. Ляшкевіч

Імя-мянушка як крыніца экстралінгвістычнай інфармацыі

Дасканала апісаць і высветліць паходжанне імён-мянушак XVI–XVIII стст. у наш час – задача няпростая. Калі грамадства знаходзілася на пачатковых стадыях развіцця, адносна нешырокая наменклатура імён дазваляла адрозніваць людзей у невялікіх кангламератах. Пазней, з развіццём грамадства, спатрэбіліся дадатковыя вылучальныя называнні. Уласныя імёны, якія надаваліся дзіцяці пры нараджэнні (да прыняцця хрысціянства – людскія свецкія, а потым – хрысцільныя), пачалі дапаўняцца мянушкамі, якімі характарызаваў асобу калектыў. Акрамя прамога выкарыстання лексікі, што існавала у той час, шляхам розных перабудаванняў ствараліся асобныя словы, найбольш прыдатныя для называння. Падобныя спецыяльныя ўтварэнні, на наш погляд, можна лічыць паўнацэннымі ўласнымі імёнамі мінулага. У адрозненне ад прозвішчаў, мянушкі – афіцыйна не замацаваныя, юрыдычна не значныя называнні. Яны знікаюць разам з носьбітам, а не працягваюць існаваць і перадавацца нашчадкам, як прозвішча. Па матэрыялах даследаваных намі помнікаў мясцовай дзелавой пісьменнасці мы можам пацвердзіць агульнапрынятую думку, што старажытныя ўласныя імёны не выходзяць з ужытку, а працягваюць існаваць нават у XVIII ст. разам з хрысцільнымі.

Зразумела, што менавіта рэальны факт кладзецца ў аснову ўзнікнення імені-мянушкі. Перш за ўсё знешнасць, паводзіны ці характар чалавека з'яўляецца падставай для ўзнікнення імені-мянушкі, таму ў іх шырока адлюстроўваюцца ўсе бакі сямейнага, грамадскага і палітычнага жыцця чалавека. Невыпадкова мы можам назваць імёны-мянушкі своеасаблівым позіркам у мінулае, таму звернем асноўную ўвагу на лексіку, што ўвайшла ў іх склад.

Большая частка імёнаў-мянушак захоўвае ў антрапаасноване лексемы, якія абазначаюць асобу па якой-небудзь прымеце ці дзейнасці. Мянушкі, утвораныя ад апелятываў, у аснове якіх характарыстыка чалавека, налічваюць 27,8% ад усіх мянушак. У помніках мясцовай дзелавой пісьменнасці Віцебшчыны і Магілёўшчыны XVI–XVIII стст. знаходзім імёны-мянушкі, якія даваліся па росце, памерах чалавека, асаблівасцях яго канстытуцыі: *Величка; Великотны; Кароткий; Малей; Малюка; Немелкий; Сухачъ; Сухан; Сухапаръ; Тонковидъ*; узросце: *Малец* – малец рэг. 'хлопец, падлетак' [1]; *Малютик – малюцік* рэг. 'дзіця, малое дзіця' [2]; *Старлетый*; колеравай прымеце: *Белоножка; Белоусъ; Буробоки; Буры; Рудой; Рудак, Рудько* – рудак, рудзька рэг. 'чалавек з рудымі валасамі', 'жывёліна з рудою, рыжаю шэрсцю' [1]; *Рыжы; Рыжыкъ; Сивоха; Синявоки; Чарнецъ; Чарнякъ* – магч. 'смуглы, чарнявы чалавек'; *Чарнячакъ*; асаблівасцях частак цела, фізічных недахопах: *Дубаносъ* – дубанос рус. 'насаль, насаты чалавек' [3]; *Хромы; Карзунъ* – карзун рус. 'без пярэдніх зубоў, шчарбаты' [3]; *Лабанъ* – лобан рус. 'чалавек ці жывёліна з вялікім ілбом' [3]; *Салагубъ* – салагубы рэг. 'чалавек з тоўстымі заўсёды мокрымі губамі' [1]; *Варапай* – рэг. 'сляпы чалавек' [2]; *Лысы; Калека; Крывы; Мурза* – 'мурзаты, запэцканы чалавек', магчыма цюрк. мурза, рус. смал. 'запэцканае дзіця' [1]; асаблівасцях гаворкі, маўлення: *Бак. Бака* – рус. 'гаварун' [3], параўн. бел. бакуліць 'пустасловіць' [2]; *Лепецюх* – магч. 'лапатуха, балбатуха', параўн. рус. лопотать, лепетать; *Шабуня* – магч. рэг. 'невыразна гаварыць' [1]; *Szawirdzia* – шавярда рэг. 'шапялявы' [1]; рысах характару, асаблівасцях паводзін: *Астрейка* – магч. 'востры на язык, жартаўнік'; *Wyrwa* – вырва, параўн. рэг. вырвас 'вісельнік, сарвігалава' [2]; *Галуза* – 'свавольнік'; *Гулецъ; Dabryk; Дюндя* – дзюндзя рэг. 'п'яніца', 'гультай' [2]; *Калитник* – магч. рус. 'валакіта, ухажор' [3]; *Кислы; Убогий.*

Нязначная колькасць імён-мянушак адлюстроўвае ўнутраныя якасці чалавека: *Остолопъ; Мысливецъ; Тупица; Танок* – магч. рус. тананы водить 'біць байды, хадзіць без работы' [3]; *Робацень* – магч. 'працавіты чалавек'.

Зразумела, што менавіта фізічныя адхіленні, асаблівасці маўлення і паводзін чалавека прыцягваюць да яго ўвагу. Таму мянушкі, матываваныя знешнім выглядам, значна дамінуюць над тымі, што характарызуюць чалавека па яго ўнутраных, разумовых якасцях, пра якія даведацца было значна цяжэй. Асноўная маса агульнабытавых імён была нейтральнай. Імёны-мянушкі, што зараз нам здаюцца зневажальнымі (*Гарбачъ, Кривашей, Клишъ*), у мінулым не ўспрымаліся так эмацыянальна, яны здаваліся натуральнымі, проста канстатавалі факт.

Звяртае на сябе ўвагу назіральнасць і дасціпнасць беларускага народа. Найменняў з адмоўным значэннем на парадак больш, чым са станоўчым. На нашу думку, у выніку анімістычнасці мыслення старажытнага чалавека, вера ў магічную сілу выкарыстоўвалася пры наданні імені: імя павінна было абараніць свайго носьбіта. «Адмоўнае» імя адводзіла ўвагу «нядобрых сіл». Магчыма таксама, што пры ўтварэнні імёнаў-мянушак не абыходзілася і без жывога народнага гумару.

У даследаваных намі крыніцах вылучаецца каля 350 імёнаў-мянушак, утвораных ад 90 апелятываў, якія ўказваюць на рамёствы і промыслы. Некаторыя з іх ужываюцца ва ўсіх вывучаных пісьмовых помніках, а рас-

паўсюджанне іншых абмяжоўваецца тэрыторыяй і нават часам. Так, напрыклад, імёны-мянушкі *Аргун, Бортник, Добошъ, Жакъ, Жарнасекъ* фіксуюцца адзінкава, а *Казак, Кравец, Каваль* сустракаюцца даволі часта. Магчыма, менавіта заняткам адрозніваліся некаторыя людзі, таму назва промыслу станавілася трапным іменем-мянушкай, якое і атрымліваў чалавек.

Па характарыстыцы распаўсюджвання тых ці іншых «прафесій» можам зрабіць некаторыя вывады пра побыт беларусаў у XVI–XVIII стст. Больш за ўсё намі засведчана імён-мянушак, якія паходзяць ад апелятываў, што характарызуюць вайскоўцаў: *Аскер, Аскерка* – араб. аскер 'войска', 'воін, салдат' засвоена многімі цюрк. мовамі [1]; *Казакъ; Стрэльник; Шаула* – літ. šaulys 'стралок', параўн. тат. шаулы 'бурны, бурлівы' [1]; *Харужы* – ад харунжы пры спрашчэнні групы зычных [нж]. Гэта можна патлумачыць гістарычнымі асаблівасцямі развіцця дзяржаўнасці таго часу. Пэўная частка антрапонімаў паходзіць ад апелятываў, што характарызуюць рамеснікаў: *Алейник; Васкабойник; Ганчар; Дайлидъ* – ст.-бел. дойлид 'цясляр, будаўнік' [4]; *Кажемяка* – 'аўчыннік, майстар, які вырабляе шкуры'; *Кацельникъ; Коваль; Калачник; Колесникъ; Кравец; Кухта* – рэг., уст. 'прыслужнік, вучань повара' [4]; *Маляр; Млинник; Пирожникъ; Пономаръ; Шапавал.* Найбольш часта сустракаюцца лексемы, якія называюць тых, хто вырабляў бочкі, калёсы, адзежу і абутак, воск і дзёгаць, гуту і шкло, піва і віно, муку і крупы, хлеб і мёд, апрацоўваў футра, скуру і аўчыну.

Гісторык М.В. Доўнар-Запольскі мяркуе, што нават у XVIII ст. дробны шляхціч вёў сваю гаспадарку па прынцыпе безабменнай: сам вырабляў муку і прылады працы, рамантаваў абутак і адзенне, набіваў бочкі [2, с. 137]. Гэта можа пацвердзіць нашу думку, што прыналежнасць да прафесіі ў той час з'яўляецца яскравай прыметай, якая дапамагае вылучыць чалавека з кола іншых.

Нягледзячы на тое, што даследавалася шмат дакументаў, у якіх разглядаюцца менавіта «зямельныя пытанні», намі амаль не засведчаны імёны-мянушкі, якія б адлюстроўвалі сельскагаспадарчую працу і жывёлагадоўлю. Думаем, гэта тлумачыцца тым, што большасць беларусаў у той час займалася менавіта апрацоўкай зямлі і гэта рыса не з'яўлялася вылучальнай.

Засведчана малакольксная група імён-мянушак, якія паходзяць ад апелятываў, што характарызуюць гандляроў: *Прасолъ* – рус., укр., рэг. бел. 'скупшчык мяса і рыбы для продажу ў розніцу' [1]; *Салсникъ* – 'прадавец солі' ? [1]; *Таргашъ*. Трэба адзначыць, што падобныя імёны-мянушкі сустракаюцца толькі ў канцы XVI ст.: сем разоў на тэрыторыі Магілёўшчыны і адзін раз на Віцебшчыне. Прычына бачыцца ў тым, што, магчыма, на Магілёўшчыне ў той час гандаль ішоў больш актыўна. М.В. Доўнар-Запольскі мяркуе, што XVII ст. – гэта эпоха не толькі паступовага заняпаду беларускага гандлю, а і ўласна віцебскага [2, с. 207, 226].

Зафіксаваны тры мянушкі, што ўтвораны ад апелятываў, якія абазначаюць рэлігійных служыцеляў: *Bogomaz* – магч. рус. богомаз 'іканапісец'; *Жакъ* – ст. бел. 'служыцель у касцёле' [4], *Панамаръ*.

Некаторыя імёны-мянушкі сустракаюцца спарадычна і абазначаюць асоб па сацыяльным стане (*Баярка* – тат., каз., туркм. баяр 'баяр, князь, дваранін' [1]; *Паненакъ; Солтанъ* – тат. 'султан' [1]) ці супрацьпастаўляюць багатых бедным (*Голобедка; Галякъ, Голы; Багаты; Багачъ* і інш.). Трэба адзначыць, што ад апелятываў шляхціч, пан, гаспадар, князь пры дапамозе фармантаў *-аў/-еў/-оў* утворана шмат патронімаў (напр., *Панаў, Гаспадароў, Князеў* і інш.), што тлумачыцца сацыяльным становішчам сялян і прыналежнасцю гараджан да прывілеяваных колаў.

Любы від дзейнасці чалавека, духоўны і матэрыяльны склад жыцця, узаемаадносіны з роднымі і суседзямі – усё гэта клалася ў аснову называння чалавека. Таму імёны-мянушкі могуць служыць гістарычнаму даследаванню жыцця народа не менш, чым іншыя гістарычныя помнікі культуры і быту, літаратуры і мовы.

Асобную групу складаюць этнонімы-мянушкі: *Жиденакъ, Жыдъ; Казаринъ; Латышъ; Литвинъ* – ст.-бел. 'літовец', 'жыхар Літвы' [1]; *Ляхъ; Мазуръ* – польск. mazur 'мазур, жыхар Мазовіі'; *Маскаль* – ст.-бел. 'падданы Маскоўскай дзяржавы' [1]; *Масквитинъ; Прусъ; Татарынъ; Туракъ Хахол; Черкасъ (Чаркес); Шведъ Чехъ*.

Зразумела, што сувязі беларусаў з рускімі, літоўцамі і палякамі маюць старадаўнія традыцыі, асабліва ў пагранічных раёнах. Па матэрыялах даследаваных намі пісьмовых помнікаў можам зрабіць наступны вывад: з рускімі жыхары Віцебшчыны і Магілёўшчыны мелі зносіны значна часцей, чым з палякамі ці літоўцамі (намі знойдзена 56 імён-мянушак, якія указваюць, што іх носьбіт 'маскаль' ці 'масквитинъ', 13 – 'Литвинъ', і толькі 3 – 'Ляхъ' ці 'Мазуръ'). Гэта абумоўлена гістарычнымі і геаграфічнымі прычынамі.

У XVI ст. наплыў іншаземцаў, асабліва палякаў, быў нязначны, закон старанна ахоўваў інтарэсы ўраджэнцаў ВКЛ. І толькі ў канцы XVII – пач. XVIII стст. у выніку міграцыі рускіх стараверaў на даследаванай тэрыторыі ўзніклі шматлікія рускія паселішчы, з развіццём прамысловасці рускія з'явіліся ў беларускіх гарадах. Трэба ўлічваць і тое, што тэрыторыя Віцебшчыны і Магілёўшчыны мае прамыя межы з Расіяй і Літвой.

Імёны-мянушкі могуць указваць не толькі на этнічную прыналежнасць носьбіта, але і на населены пункт ці канкрэтнае месца нараджэння або жыхарства. Намі зафіксаваны наступныя імёны-мянушкі: *Быхавец* – ад Быхаў; *Волынецъ* – ад Валынь; *Lubinec* – магч. ад Любна; *Магилевец* – ад Магілёў; *Палачанинъ* – ад Полацк; *Smolonik* – ад Смаленск або Смальняны.

Імёны-мянушкі, не будучы афіцыйна замацаванымі называннямі, маглі змяняцца ў залежнасці ад месца і спосабу жыцця. Адна і тая ж асоба магла атрымаць некалькі мянушак. Напрыклад, аднаго чалавека маглі называць *Станька Рыбак* і *Станька Рыбак Прыхожы*. Зразумела, што найменне Прыхожы далучалася там, дзе яно магло выканаць намінатыўна-ідэнтыфікуючую функцыю (указаць на тое, што яго носьбіт – немясцовы, прышлы). Падобныя антрапонімы характарызуюць асобу як новага жыхара: *Навой; Новикъ; Новоселецъ*. Акрамя агульных указанняў на немясцовасць (*Бейманъ* – кірг. 'госць' [1]; *Захожий; Прыхожый*), імёны-мянушкі захавалі указанне на характар з'яўлення асобы ў населеным пункце (*Ардынецъ* – ордынецъ 'палонны, выкуплены з ардынскага палону'; *Бегинъ; Воротынецъ*). Цікавасць выклікаюць найменні *Земляк, Месникъ, Стараселецъ*. Зразумела, што падобныя называнні не выконваюць асноўнай функцыі імені – вылучальнай, але калі ў *Амяляна Земляка, Мацея Месніка і Балцера Стараселеца* былі прышлыя суседзі з такімі ж імёнамі, мянушка пачынае выконваць сваю функцыю.

Імёны-мянушкі маглі характарызаваць чалавека па сямейных адносінах: *Sirota; Swatko; Адинецъ* – ст.-рус. одиньцъ 'адзінокі, бессямейны чалавек' [1]; *Дзядзинец, Дядька; Дзед; Здольникъ* – 'прыняты ў сям'ю з роўнай доляй' [1]; *Траян* – 'бацька траіх блізнят' [1]. Наступная група імён, на нашу думку, адрозніваецца ад вышэй пералічаных не толькі лексічна, але і функцыянальна. Гэтыя імёны-мянушкі надаюцца пры нараджэнні і ўказваюць на адносіны бацькоў да нованароджаных ці на чарговасць нараджэння дзіцяці: *Нечай* – 'дзіця, якога не чакалі'; *Пазнека, Познякъ* – 'дзіця, якое з'явілася позна'; *Петко; Седьмой; Шестакъ, Шостакъ*.

Імёны-мянушкі адлюстроўваюць сям'ю як неад'емную частку грамадскай сістэмы, вылучаючы сярод выхаваўчай, гаспадарча-эканамічнай, рэкрэатыўнай (узаемадапамога, падтрыманне здароўя) і іншых функцый беларускай сям'і асноўную – рэпрадуктыўную.

Імёны-мянушкі разам з іншымі помнікамі мовы могуць стаць адной з крыніц не толькі лінгвістычных, але і гістарычных, сацыялагічных і этнаграфічных даследаванняў. У іх асновах – жыццё далёкага мінулага: жывёльны і раслінны свет, з'явы прыроды і асаблівасці з'яўлення чалавека, прадметы быту і рамёствы, асаблівасці сямейных адносін і разумовых якасцей нашых продкаў.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Бірыла М.В.*** Беларуская антрапанімія: Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі. – Мінск, 1968. – 508 с.
2. ***Доўнар-Запольскі М.В.*** Гісторыя Беларусі. – Мінск, 1994. – 510 с.
3. ***Даль В.*** Толковый словарь живого великорусского языка: В 4 т. – М., 1978–1980. Т. 1–4.
4. ***Насовіч І.І.*** Слоўнік беларускай мовы. – Мінск, 1983. – 792 с.

SUMMARY

The article deals with one of the most ancient anthroponic forms – nickname. The brightest patterns of correlation of anthroponic foundations with lexical grounds are distinguished in the article. Manuscript memorials of a local business writing of Vitebsk and Mogilev regions of the XVI–XVIII th centuries served as materials for investigation. They are the source of learning not only the standards of social-business style but an alive conversational language too.